Маштабны выставачны праект «Чакайце нас, зоркі» праходзіць у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. Асновай для стварэння экспазіцыі сталі архіўныя фота- і відэаматэрыялы, плакаты савецкага часу, прысвечаныя космасу і развіццю навуковых тэхналогій, перыяду, калі гэтыя тэмы былі звязаны з актыўным рухам у новы свет навукі і тэхнічнага прагрэсу. Так, прадстаўлены работы вядучага касмічнага мастака СССР Андрэя Сакалова і касманаўта Аляксея Лявонава. Адзін з альбомаў іх творчага саюза — «Чакайце нас, зоркі» — быў выкарыстаны ў якасці назвы праекта. Асобная зала ў экспазіцыі прысвечана феномену захаплення ўсім паранармальным у познесавецкі перыяд. На выстаўцы прадстаўлены творы з фондаў Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, расійскага музея-запаведніка Юрыя Гагарына, Нацыянальнай бібліятэкі, Музея гісторыі горада Мінска, Нацыянальнага гістарычнага музея, Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, а таксама твораў сучасных беларускіх аўтараў. Выстаўка працуе да 29 студзеня.